Источник: "Веды" - 2013-08-26



# У.Гусакоў: «З’езд сабраў навуковую гуманітарную эліту»

**Больш за 600 навукоўцаў з 35 краін свету (усіх славянскіх краін, большасці заходнееўрапейскіх, а таксама ЗША, Канады, Ізраіля, Японіі) сабраліся на мінулым тыдні ў Мінску, каб прыняць удзел у XV Міжнародным з'ездзе славістаў. У гэтыя дні з’езд заканчвае сваю працу: навукоўцы разважаюць пра вынікі, абменьваюцца кантактамі і пачынаюць рыхтавацца да наступнага з’езду славістаў, якія ладзяцца раз на пяць год.**



У рамках з’езду даследчыкі прынялі ўдзел у пасяджэннях спецыяльных камісій, круглых сталах, прэзентацыях, слухалі шмат цікавых дакладаў. Большая частка пасяджэнняў праводзілася ў сценах Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, а ўрачыстая цырымонія прайшла ў канцэртнай зале «Мінск». Акрамя таго, гасцей чакала разнастайная культурная праграма, экскурсіі па гістарычных мясцінах Беларусі. Кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі арганізавала прыём дэлегацыі старшынь нацыянальных камітэтаў славістаў краін-удзельніц. Ганаровыя госці азнаёміліся са структурнай і асноўнымі напрамкамі дзейнасці вядучай навуковай установы краіны, наведалі музей НАН Беларусі.

У дні з’езда ў МДЛУ дзейнічала выстава славістычнай літаратуры, выдадзенай за апошнія пяць год у розных краінах. На ёй былі прадстаўлены каля тысячы розных выданняў, прысвечаных славянскім мовам, культуры, літаратуры. Гэтыя выданні асвятляюць як вузкаспецыялізаваныя пытанні, так і тэмы, якія будуць цікавы шырокаму колу чытачоў. Дарэчы, усе кнігі (а гэта літаратура прыехала больш чым з дваццаці краін) цяпер – скарб Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Прывітальныя словы ўдзельнікам з’езду даслаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка:

– Славянскі свет – наша агульная духоўная Айчына, якая аб'ядноўвае мільёны людзей. На вучоных-славістаў ускладзена пачэсная місія: берагчы і памнажаць скарбы мудрасці і культуры, садзейнічаць распаўсюджванню ведаў пра славянскія народы. Вы з гонарам выконваеце яе і падтрымліваеце агонь, які запалілі першаасветнікі святыя Кірыл і Мяфодзій. Сімвалічна, што месцам правядзення юбілейнага форуму абрана Беларусь – сэрца славянскай цывілізацыі, якая ўносіць важкі ўклад у захаванне яе каштоўнасцей і ідэалаў. Беларусы берагуць гэту спадчыну і заўсёды памятаюць аб тым, што толькі разуменне ўнікальнасці кожнай нацыі і яе духоўных здабыткаў не дасць братам-славянам страціць сябе ў глабалізаваным свеце.

Дарэчы аб сімвалічнасці правядзення з’езду ў нашай краіне было сказана не аднойчы. Госці форуму прысвяцілі цёплыя словы беларускім асветнікам Еўфрасінні



Полацкай, Кірылу Тураўскаму, нашаму першадрукару Францыску Скарыне, вядомаму даследчыку Яўхіму Карскаму. «Нам ёсць чым ганарыцца, што паказаць свету са здабыткаў славянскай культуры, з’езд – гэта добрая магчымасць прадэманстраваць на міжнародным узроўні поспехі беларускай навукі», – падкрэсліў міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў. А міністр адукацыі Беларусі Сяргей Маскевіч адзначыў, што сёння ў беларускіх студэнтаў ёсць магчымасць вывучаць многія славянскія мовы і для папулярызацыі славістыкі зроблена шмат: працуюць спецыяльныя лабараторыі, ладзяцца спецкурсы. Неаднойчы падкрэслівалася і тое, што з’езд праводзіцца ў год святкавання 1025-годдзя Хрышчэння Русі, якое дало вялікі штуршок для развіцця славянскіх моў і культур.

На думку Намесніка Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, старшыні аранізацыйнага камітэта з’езда Уладзіміра Гусакова, славянская культура ў Беларусі знаходзіцца на высокім узроўні, а правядзенне з’езду ў нашай краіне можна расцэньваць як прызнанне ўзроўню беларускай нацыянальнай славістыкі, ролі беларускай мовы і літаратуры ў агульнай славянскай прасторы. Ён падкрэсліў, што ў НАН Беларусі праводзяцца буйныя даследаванні на ніве літаратуры, мовы, выдаюцца шматлікія працы, якія засведчылі багацце беларускай мовы і культуры.

– З’езд сабраў навуковую гуманітарную эліту, якая вызначае новыя напрамкі развіцця сучаснай славістыкі, забяспечвае захаванне славянскай ідэнтычнасці, – лічыць У.Гусакоў.

Думку, што правядзенне з’езду менавіта на Беларусі можна разглядаць як прызнанне навуковых поспехаў, падтрымлівае і старшыня Міжнароднага і Беларускага камітэта славістаў Аляксандр Лукашанец.

– Славістыка – комплексная навука, і ў XXI стагоддзі яна захоўвае свае значэнне як асобнае адгалінаванне гуманітарных навук. Цікавасць да славянскага свету не змяншаецца, а нават узмацняецца. Ёсць людзі, неабыякавыя да падтрымання і пашырэння ведаў пра славянскія мовы, літаратуру, культуру. Сучасныя этапы развіцця грамадства ставяць новыя задачы для славістаў свету.

Дарэчы аб новых задачах і нават праблемах на з’ездзе было сказана шмат. Так, Аляксандр Лукашанец адзначыў, што зараз вельмі актуальна падтрымка традыцый славістыкі. Чаму? Ва ўмовах глабалізацыі ў нашых мовах з’яўляецца шмат запазычанняў, а гэта можа прывесці да нівеліравання нацыянальных асаблівасцей. Замежныя словы пранікаюць у тыя камунікатыўныя сферы, якія раней абслугоўваліся нацыянальнай лінгвістыкай: спорт, бізнес, культура, інтэрнэт-камунікацыі.

У кола тэм XV Міжнароднага з’езда славістаў трапіла шмат цікавых пытанняў: гісторыя славянскіх моў у сувязі з праблемамі этнагенезу і глотагенезу, лакалізацыя праславянскай моўнай прасторы і яе структура, славянская этымалогія і анамастыка, гістарычнае апісанне славянскіх моў і дыялекталогія, гістарычная граматыка славянскіх моў, славянская пісьменнасць на розных этапах яе развіцця, моўныя сітуацыі ў славянскім свеце, камп’ютарная і корпусная лінгвістыка ў даследаванні славянскіх моў, славянскі фальклор, міфалогія і традыцыйная духоўная культура, гісторыя славістыкі.

Перааацаніць значэнне з’езду для развіцця славістыкі ў Беларусі і ва усім свеце цяжка. Як добра выказаўся старшыня Расійскага Нацыянальнага камітэта славістаў Аляксандр Малдаван, такія мерапрыемствы – гэта магчымасць разам паразважаць аб актуальных і прыярытэтных пытаннях славістыкі, і задумваліся такія з’езды менавіта для арганізацыі калектыўных намаганняў для вырашэння агульных пытанняў.



– Міжнародная славістыка – гэта не толькі з’езды, гэта таксама праца, якая праводзіцца паміж з’ездамі, – кажа навукоўца. – Сумесная праца славістаў дазволіла стварыць каталогі славянскіх рукапісаў, выдаць сотні слоўнікаў, якія далі неабходную для абмеркавання праблем філалагічную базу.

На думку А.Малдавана, зараз адна з найважнейшых задач – гэта свядзенне вялізарнага матэрыялу славянскіх пісьменных помнікаў і жывых моў у адзіны комплекс, арганізаваны такім чынам, каб з яго дапамогай можна было атрымаць любую інфармацыю па максімальна шырокаму колу крыніц.

– Філалогія – гэта адна з найстаражытных навук у гісторыі чалавецтва. Мова захоўвае для нас гісторыю і тыя сэнсы, якія ёй спадарожнічаюць, – кажа А.Малдаван. – Якімі б прагматычнымі не прадстаўляліся сёння дзяржавы і грамадства, іх не можа не цікавіць гісторыя свайго народа. А гэта значыць, наша праца будзе запатрабавана.




**Васіліна МАЦУТА, «Веды»**
**Фота аўтара і з інтэрнэта**